Класік беларускай літаратуры




**У**ладзімір Сямёнавіч Караткевіч — класік беларускай літаратуры, паэт, празаік, драматург, кінасцэнарыст, публіцыст, перакладчык.

26 лістапада, у дзень нараджэння вялікага пісьменніка, вучні 10 класа,якія вывучаюць беларускую мову на павышаным узроўні, правялі вусны часопіс "Быў. Ёсць. Буду" для старшакласнікаў школы. Пад час мерапрыемства вучні бліжэй пазнаеміліся з асобай пісьменніка і яго творчасцю.

Уладзімір Караткевіч стаў адным з духоўных сімвалаў сучаснага беларускага адраджэння. Гэта чалавек з актыўнай жыццёвай пазіцыяй, сумленнем патрыёта і грамадзяніна, якога больш за ўсё хваляваў лёс беларускага народа. З цягам часу інтэрэс да асобы і творчасці Уладзіміра Караткевіча не змяншаецца, усё больш шырокае кола людзей цікавіцца яго творамі.

***Вучаніцы 10 класа ДУА "Сярэдняй школы №4 г.Магілёва"***
***Зямлінская Паліна і Цівунова Ліліяна***